Hod VIII. Lipień-Žnivień 1936 h. № 7-8.

Шлях Моладзі
Šlach Moładzi

…„Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі!
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі."
ЯНКА КУПАЛА.

V I L N I A

Bielaruskaja Drukarnia im. Franciška Skaryny — Vilnia, Zavalnaja vul. 1—2.

ЗЬМЕСТ № 7-8:

BIEŁARUSKAJA ABECEDA.

Беларуская абэцэда.

A, a — А, а.	J, j — Й, й.	R, r — Р, р.
B, b — Б, б.	Ja, ja — Я, я.	S, s — С, с
C, c — Ц, ц.	Je, je — Е, е.	Ś, ś — СЬ, сь.
Ć, ć — ЦЬ, ць.	Ju, ju — Ю, ю.	Š, š — Ш, ш.
Č, č — Ч, ч.	K, k — К, к	T, t — Т, т.
D, d, — Д, д.	L, l — ЛЬ, ль.	U, u — У у.
E, e — Э, э.	Ł ł, — Л, л.	Ŭ, ŭ — Ў, ў.
F, f — Ф, ф.	M, m — М, м.	W, w, V, v—В, в.
G, g — Г, г.	N, n — Н, н.	Y, y — Ы, ы.
H, h — Г, г.	Ń, ń — НЬ, нь.	Z, z — З, з.
Ch, ch — Х, х.	O, o — О, о.	Ž, ž — Ж, ж.
I i — І, і.	P, p — П, п.	Ź ź — ЗЬ, зь.

„Шлях Моладзі"
МЕСЯЧНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ.

Складка на 1 месяц 30 гр.; на 3 месяцы 50 гр., на паўгода— 1 зл., на год — 2 зл.

Заграніцу — ўдвая даражэй.

Адрас Рэдакцыі: Вільня (Wilno), Завальная № 1—2
Рэдакцыя адчынена ад гадз. 9 да 3-яй папаўдні.

Шлях Моладзі

МЕСЯЧНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ.

Год VIII.	Вільня, Ліпень-Жнівень 1936 г.	№ 7-8 (93-94).

Міхась Машара

* * *

Ізноў шагаю па аржышчы,
Наўкол снапы, снапы, снапы.
Кудлаты вецер песьні сьвішча
Ля кожнай бабкі і капы.

Нядаўна так зьвінеў ў калосьсі
Вясёлы май над васільком.
Цьвілі сады... і ў вербалозьзі
Вясна шаптала з ручайком.

А хутка восень, як калісьці,
Здалёк да нас прыйдзе ізноў.
Разложыць карты жоўталісьця
І захварбуе клён у кроў.

Тугу і сум наўе на сёлы,
Нуду у хаты прынясе,
І будуць будні невясёлы,
Як мох адцьвіўшы на страсе.

— — — — — — —

Жадаў-бы лад зьмяніць я гэты,
Адвечны лад старой зямлі
І затрымаць вясну і лета,
Каб краскі з песьняй век цьвілі.

19.VII.1936.



Максім Танк

* * *

Ясна зоры гарэлі,
зорна так, як ніколі;
заблудзіўшыся ў полі,
жнеяк песьні зьвінелі.

Сумна і невясёлым
пералівам калосьсе
гаварыла, што восень
прыйдзе хутка ў сёлы.

Змоўкне лес, як калісьці...
а ў гушчарах, у нетрах
зазьвіняць у паветры
ападаючы лісьце,

абтрасаючы росы,
лісьце дымам чырвоным;
і засьцеляцца лёнам —
павуціньнем палосы...

І ня верыцца неяк,
і ня хочацца верыць,
бо мінець гэты шэры
дзень, як рэха жалеяк.

І хоць сяньня так востра
баляць рукі і ногі, —
папрыходзяць з вастрогаў
нашы жнеі і сёстры.

Днём і ноччу на нівах,
ды ня сьлёзы жалеяк,
будуць весела жнеі
разсяваць пералівы.

І на пасеках чорных
лес падыймецца гонкі,
загамоняць сасонкі
перашумам узорным.

Што-ж, мо' сяньня панура
звоняць нашы напевы, —
часам песьні і дрэвы
заціхаюць прад бурай.

1936.

Імкненьні і дамаганьні беларускае моладзі на найбліжэйшую будучыню

Жывём у часох розных вялікіх і малых нарадаў, канфэрэнцыяў, кангрэсаў — краёвых і міжнародных, — культурных і палітычных, — ладжаных арганізацыямі людзей старэйшых і моладзі. Вось, напрыклад, у канцы ліпня і на пачатку жніўня сёлета ў Аўстрыі адбыўся XV Міжнародны Кангрэс каталіцкае арганізацыі моладзі „Pax Romana". На пачатку верасьня сёлета ў Бруксэлі (Бэльгія) мае адбыцца агульны міжнародны кангрэс моладзі, на якім маюць абгаварвацца найбольш важныя для моладзі справы.

Аб кангрэсе моладзі ў Бруксэлі ўжо шырака ведама на беларускай вёсцы. Наша рэдакцыя атрымлівае пісьмы, у каторых беларуская вясковая моладзь займае прыхільнае становішча да гэтага кангрэсу, падае свае прапановы дамаганьняў, намячае вехі для становішча беларускае моладзі і нават выстаўляе кандыдатаў на дэлегатаў. Мы аднак, гледзячы на гэту справу цьвяроза, згары можам сказаць, што беларускай моладзі будзе вельмі цяжка выслаць на кангрэс у Бруксэлю сваіх дэлегатаў, як было б цяжка гэта самае зрабіць на які-небудзь іншы, найбольш нявінны, міжнародны кангрэс заграніцай, бо-ж жывём у такіх абставінах, якія нам не пазволяць гэтага зрабіць. Такім чынам, імкненьне беларускае моладзі, выйсьці на шырэйшыя міжнародныя воды, засядаць з моладзьдзю іншых народаў, радзіць над палепшаньнем быту маладога пакаленьня, шукаць выхаду з цяжкага палажэньня, прадставіць усяму сьвету нашыя беларускія імкненьні, нашыя беларускія балячкі, карыстаць з так патрэбнае нам міжнароднае трыбуны, — пакульшто ўсьцяж тамуецца. Верым аднак-жа, што ня век будзем гараваць і што прыйдуць часы лепшыя і шчасьлівейшыя...

Але ня будзем цешыцца прыгожымі надзеямі. Гляньма навокал сябе, пабачма, што робіцца і зрабема з гэтага плян на найбліжэйшую будучыню.

Сяньня нашае палажэньне цяжкое. Сяньня польскія абшарнікі, эндэкі, featured рознага роду санатары і кансэрватысты, на чале з віленскім „Słowam", адкрыта гразяць нам асыміляцыяй.

Сяньня на вёсцы нашай пашыраецца бяда, беззямельле, безрабоцьце і цемната. Мы, беларуская моладзь, ня маем нават свае арганізацыі, бо адміністрацыйныя польскія ўлады адмовіліся, без паданьня нават прычын, залегалізаваць статут Таварыства Беларускае Моладзі „Будучыня", а таксама і статут Беларускага Спартовага Таварыства „Гайсак". На вёсцы беларуская моладзь ня можа цяпер ужо нават ладзіць вечарынак без дазволу.

Школаў сваіх бадай што ня маем, бо што-ж значаць гэтыя 60 школаў на 1,600,000 беларусаў у Польскай Дзяр-

жаве, паводле польскае ўрадавае статыстыкі (паводле іншых жарол у Польшчы ёсьць больш 2,5 міл. беларусаў), у каторых, як гаварыў Віленскі Школьны Куратар, беларуская мова „ўзята пад увагу“? Што-ж значыць адна беларуская гімназія, і тая несамастойная, на такі хоць-бы лік беларусаў?

Сяньня на беларускай вёсцы часта густа можна спаткаць старых дзяцюкоў, якія ня жэняцца толькі дзеля таго, што ня маюць працы і агулам больш-менш нармальных варункаў да жыцьця. Цяжкія абставіны сяньняшняга дня адбіраюць ім права быць жанатымі. Моладзь наша фактычна марнуе свае маладыя гады і сілы.

Так, цяжка жывецца. Цяжка так-жа вясьці барацьбу за лепшае заўтра. Ня гледзячы аднак на ўсё, мы яе вядзём і вясьці будзем. Найбліжэйшым нашым заданьнем ёсьць бязумоўна справа стварэньня свае беларускае арганізацыі моладзі, справа згуртаваньня і сцэмэнтаваньня сваіх сілаў. Аднaчасна-ж мы, беларуская моладзь, згуртаваная каля „Шляху Моладзі“, імкнучыся да зьдзейсьненьня найвышэйшага свайго беларускага ідэалу, выражанага Актам 25 сакавіка 1918 г., абвяшчаючага Беларусь Вольнай і Незалежнай, **дамагаемся** і заклікаем усю беларускую моладзь дамагацца:

1. Бясплатнага надзелу зямлёй беззямельных і малазямельных сялянскіх беларускіх гаспадарак; працы для беспработных бел. работніцкаў і беларускае інтэлігенцыі ў дзяржаўных установах.

2. Адчыненьня на тэрыторыі Польскай Рэспублікі, заселенай беларусамі, здавальняючай колькасьці беларускіх пачаткавых, сярэдніх агульна-навучаючых і фаховых школаў і унівэрсытэту; у першую-ж чаргу адчыненьня зьліквідаваных беларускіх пачаткавых і сярэдніх школаў; зьніжэньня аплаты за навуку ў школах сярэдніх і на унівэрсытэце: стыпэндыяў для незаможных, але здольных вучняў.

3. У галіне пазашкольнае асьветы дамагаемся: — свабоднага разьвіцьця для беларускіх культурна-асьветных і эканамічна-гаспадарчых установаў; свабоды ў ладжаньні вечарынак, бібліятэкаў, курсаў для дарослых і народных дамоў, дзе-б свабодна беларуская моладзь магла знайсьці і чытаць сваю беларускую кніжку, газэту, сарганізаваць хор, прадстаўленьне, знаёміцца са спортам і агулам вучыцца жыць паграмадзку і культурна.

4. Роднае беларускае мовы ў сьвятынях — цэрквах і касьцёлах.

5. Урэшце, дамагаемся права выбарчага голасу моладзі ад 21 году, свабоды слова, друку, сабраньня і арганізацыі і агулам забясьпячэньня прыроднага права Беларускага Народу на існаваньне, як асобнай нацыі.

Аднaчасна выражаем свае і ўсяе беларускае моладзі імкненьні да добрага сужыцьця ўсіх народаў.

Мы за цеснае супрацоўніцтва з літоўскаю і украінскаю дэмакратычнаю моладзьдзю, а так-жа з моладзю іншых народаў спрыяючых адраджэньню беларускага народу. Пры тым дамагаемся ад польскае дэмакратычнае моладзі заняць адносна Беларусаў выразнае становішча. Дамагаемся так-жа ад яе заняць выразнае становішча ў справе беларускае школы. Мы хочам ведаць, хто наш вораг, а хто прыяцель. Мы хочам пачуць, што голас асымілятара беларусаў, Cat'а-Мацкевіча з віленскага „Słowa" ёсьць голасам банкрутуючых абшарнікаў, а не польскага грамадзянства і моладзі. Мы ня верым, каб усё польскае грамадзянства, каб польская моладзь мела так кароткую памяць аб сваей гісторыі і так ганебныя пляны, як Мацкевіч...

Сяньня ўвесь сьвет гаворыць аб міры і вайне. Для беларускае моладзі вайна ў сучасны мамэнт зьяўляецца часта надзеяй зьмены на лепшае. Міма таго, беларуская моладзь, гэтыя, аслаўленыя знаўцамі, неперaможныя ваякі, а спакойныя па сваей прыродзе і дабрадушныя людзі, добра разумеюць, што вайна ў сучасны мамэнт Беларусам можа даць. Мы ведаем, што вайна прынясе перадусім зьністажэньне моладзі, што нішчожыць будзе ўсё, а між іншым і нашую краіну. Мы бачым захопніцкія апэтыты імпэр'ялістаў і ведаем, як страшнай будзе цяпер вайна — таму мы проціў яе. Мы за мір!..

Мы верым, што шляхам усьведамленьня беларускае моладзі, шырокіх беларускіх масаў, шляхам творчае і вытрывалае працы і барацьбы дойдзем да лепшае долі...

Мы, беларуская моладзь, сяньня падаем голас за мір, але аднaчасна дамагаемся так-жа і поўнага справядлівага вырашэньня нацыянальнае праблемы ўсіх пакрыўджаных сяньня народаў, бо йнакш міру ня будзе!...

Я. Н.

Андрэй Чэмер.

На родным палетку 5)

V.

— Васіль!... Васіль!... Уставай!!...

— Паліцыянты прыйшлі!... Адзявайся барджэй!...

Ня ўсьпеў нацягнуць на сябе рубашкі і ботаў, як увайшло 3 паліцыянтаў з руж'ямі, рэвольвэрамі і паперамі ў руках.

— „Pan jest Bazyli Hryniewicz?"

— Так. А ў чым справа?...

— „Mamy nakaz zrobić rewizję u pana celem odszukania bibuły komunistycznej i zapasów broni!"

— Броні?... Бібулы?... Але-ж я не займаюся палітыкай, ані вайсковымі справамі і ніякай „броні", ані нялегальных друкаў ня маю!...

— „To dopiero śledztwo wykaże! A teraz dokonamy rewizji osobistej. Nikomu nie wolno opuszczać pokoju!“

— — — — — — — —

* * *

Рэвізія трывала блізу шэсьць гадзін. Вынікі яе для Васіля былі дадатнія, бо ж ані „бібулы“, ані „броні“ ў яго ня было, затрымана аднак была карэспандэнцыя і Васіля ўсё-ж-такі паліцыя арыштавала. Апрача яго арыштавалі яшчэ некалькі найбольш энэргічных хлапцоў і павязьлі няведама куды. Тыя, што асталіся ў вёсцы, ня ведалі што рабіць, хоць горача спачувалі арыштаваным, ведаючы якія „прыемнасьці...“ будуць іх спатыкаць Аставалася толькі чакаць.

Горш было з каапэратывам. Цэнтральнай пружыны — Васіля ня стала... Заступіць — ня вельмі знаходзілася каму. Прапаў запал і тая нязломная воля, якую меў Васіль.

Старыя сяляне, бачачы, што ў справу ўмяшалася паліцыя, чым скарэй адсунуліся ад каапэратыўнай акцыі, здаючыся на іншых.

Алеся, перапалоханая арыштамі, ня ведала наагул што пачаць. Адным словам запанавала бязладзьдзе і хаос...

Так трывала некалькі тыдняў. Аж пэўнага дня Сёмка атрымаў ліст ад Васіля, у якім той пісаў, што няма чаго вельмі клапаціцца, паліцыя яму нічога ня зробіць, бо няма ніякае віны.

Далей, радзіў Сымону і Алесі зьвярнуцца да настаўніка Грэчкі, які не адкажацца памагчы ў справе каапэратыву. І больш нічога ў лісьце ня было, апрача замазаных цэнзураю радкоў.

Парадзіўся Сымон з хлапцамі, паклікаў Алесю ды пайшлі да настаўніка Грэчкі.

Аднак паскольні ўчынным і талковым аказаўся настаўнік, пастолькі знайшліся перашкоды паміж самых сялян. Нават тыя дзядзькі, што даклярвалі даць паі, цяпер адгаворваліся то сяк, то так, кожын чакаў на другога; адным словам, ня мелі патрэбнага зразуменьня для так важнай справы.

Праўда! мельнік Брычкоўскі, Дзядзька Антось Магіла ды яшчэ некалькі сьведамейшых людзей адразу далі складку, але гэтага было мала.

Тады настаўнік, Алеся, Сымон і яшчэ некалькі хлопцаў ды дзяўчат,— пастанавілі самі злажыць свае паі і зьвярнуцца з заклікам да моладзі іншых вёсак.

— Старыя ня хочуць, то й ня трэба! — казала Алеся. — Самі дамо рады!

І праўда! Моладзь ахвотна гарнулася да каапэратыву, ня слухаючы зьвягі здраднікаў і чужынцаў.

Хто колькі мог даў адразу, а рэшта дапаўнялася то заробкамі, то ў складчыну, то сям-там дапазычыўшы...

Крыху з Зарэчча, крыху з ваколічных вёсак—ды й так, цераз тыдняў 3—4 сабралася каля 40 паёў па 15 злотаў.

З гэтым справу можна было пачынаць, тым больш што ўдалося коопэратыву залегалізаваць.

VI.

Мінула пяць гадоў. У Зарэччы, як што году, адбываўся на Пятра фэст. Пагода была нязвычайна прыгожая. Сонейка тысячамі праменьняў абсыпала дасьпяваючае збожжа, серабрыстымі пералівамі мігацела ў рухлівых хвалях возера, залаціла саламяныя стрэхі вясковых сялібаў. На небе ня было аніводнае хмаркі.

Вецер пяшчотна шапацеў лістамі прыдарожных бяроз.

Яшчэ зранку маладыя і старыя, хто па сабе, хто грамадкамі з усіх бакоў пстракатымі шнуркамі цягнуліся ў Зарэчча.

Вясёлыя гутаркі, сьмехі і жарты былі чутны па ўсіх сьцежках і дарогах. Жыцьцё быццам выступіла з берагоў і пералівалася жывымі фарбамі буйнай моладасьці, энэргіі і надзеі.

Сотні фурманак, пад гукі шаластуноў, мкнулі на фэст, мінаючы і абкідаючы дарожным пылам пешых падарожных.

Але ня ўсе сьпяшаліся на фэст.

Вёрст дваццаць ад Зарэчча, чуць сьвет выйшаў са Старгораду дзядзька Трахім. Цесна зьвязаны клунак за плячамі, падарожны куфэрак і кій у руках. Ішоў паволі, разглядаючыся, прыпамінаючы сабе кожын куст, кожнае дрэва, кожын курган.

Пятнаццаць год таму назад выехаў з дому, а цяпер з далёкай Францыі вяртаецца ў родную вёску.

Бацькі даўно памерлі, астаўся толькі брат і замужняя сястра. Зарабіў трохі грошаў на чужыне, трэ' дакупіць сёетое да гаспадаркі, прымасьціцца пры брату ды дажываць век на бацькаўшчыне...

Шмат што зьмянілася ад часу выезду дзядзькі Трахіма.

Вёскі разбудаваныя, лясы павыкарчоўваны, новыя дарогі папракладаны...

„А як мая родная вёска выглядае?“—думаў сабе Трахім.

„Ці тая-ж самая галеча, вызыск жыдоў і абшарнікаў?.. Ці такая-ж самая цемната, п'янства і бруд, як даўней?“

Бо, пабачыўшы заходнія краіны, зразумеў дзядзька Трахім, як далёка адстаў наш народ ад другіх, як занядбаныя і пакрыўджаныя гэтыя шэрыя беларускія вёскі...

Выехаў Трахім з бацькаўшчыны несьвядомым беларусам.

На чужыне пыталіся ў яго: хто ты? Казаў—рускі. Але расейцы сьмяяліся з яго гутаркі і ня прыймалі ў сваю кумпанію. Казаў — паляк, але папольску таксама ня ўмеў гаварыць і між палякамі чуўся чужым і адзінокім. Вось тады сустрэў дзядзька Трахім сьвядомага беларуса Гутара, які яму адкрыў вочы на праўду. Ад таго часу дзядзька Трахім пачаў цікавіцца беларускім рухам, выпісваць родныя газэты,

дзе чытаў пра далёкую родную краіну. Працуючы ў францускіх капальнях, мроіў аб тым, як-бы йначай цяпер рабіў,— каб апыніўся на бацькаўшчыне... Як адкрыў-бы братом-сялянам вочы на зьдзек і крыўды, якую яны церпяць, і на спосабы барацьбы з імі.

І вось цяпер мрыя сталася праўдай! Ізноў ён на бацькаўшчыне, ізноў чуе навакол родную мову, ізноў аглядае родныя сялібы і палеткі...

А вось і родная вёска Зарэчча!... Здалёк блішчыць крыж вясковай цэркаўкі на ўзгорку, белым пасмам, як страла, бяжыць вуліца між сялянскіх хат, жывым люстрам блішчыць возера ля млына...

Здалёку далятае так знаны гук званоў, відаць каляровыя, быццам кветкі, вопраткі жанчын і сялян.

— Ах, праўда! Сягоньня-ж фэст! — прыпомніў дзядзька Трахім. А вось і дом! Як даўно няпераступаў гэтага парогу... Але ў хаце нікога не застаў, пакінуў клункі і пайшоў далей на вёску.

Замест гразкіх каляінаў і шырокіх лужын, вуліца гладка выбрукавана. Нямала хат пакрыта бляхаю, а сям-там відаць будынкі з бэтонных пустакоў...

А гэта што за прыгожы, прасторны гмах? І нейкая вывеска? — Ах! Родная беларуская школа!... А там: „спажывецкі сялянскі каапэратыў „Грамада." Вайшоў дзядзька ў сярэдзіну: прасторнае памешканьне, на паліцах поўна розных тавараў, на сьцяне беларускі календар, партрэт Купалы, Пагоня...

Радасьць адняла мову Трахіму. Вось дачакаўся, — думае сабе. — Відаць тут нехта выперадзіў мае намеры...

Прыгожая дзяўчына, адправіўшы іншых кліентаў, зьвярнулася да яго: „Вы, грамадзянін, чаго жадаеце?"

Але адкуль гэтае дзяўча?... Папросту вылітая Ганна Драчыха!... — Выбачайце, ці вы не дачка Міхася Драча?...

— Але. А вы здалёку, грамадзянін?

— О, паненачка, вы ня памятуеце... Я брат Хведара Буйды, вярнуўся з Францыі на бацькаўшчыну.

— А!.. Вось добра! Я чула ўжо з вашых лістоў да брата, што сьвядомы з вас чалавек.

Ну, вельмі добра! Яшчэ адным сябрам узбагаціцца каапэратыў. А сягоньня не забудзьцеся прыйсьці на сьвята 5-х угодкаў існаваньня нашага каапэратыву!

Адбудзецца ў нашым уласным будынку беларускай школы.

„Так, —разважаў Трахім выходзячы з каапэратыву. А усё ж такі не прападзе наш народ! Памаленьку, памаленьку, ачнецца ад векавога сну, пачне новае будаўніцтва, будаўніцтва працоўных і будзе жыць так, як трэба...

(д. б.)

Максім Танк

У дарозе.

(Шкіцы з Наваградчыны)

Вечар.

Далёка разьвярнулася поле зрэзанае безканечнымі межамі, быццам хтось выцягнуў на расу, бяліць палотны — вузкія палосы.

Нас дзесяць чалавек. Усе маўчаць. Кожны аб нечым думае... Я гляджу на Наваградчыну, на пакрытыя густым, кудлатым жытнім дыванам узгоркі і, здаецца што перадамной ляжыць шырокае як вокам абняць усхваляванае, застыўшае мора. Ляглі першыя вячэрнія цені, а цішыня чутка прыслухоўваецца да кожнага голасу ці неасьцярожнага шопату калосься. .

Наперадзе загяялі.

— Дзядзька, далёка йшчэ вёска?

— Два ці мо' тры кілямэтры...

— Каб толькі бяз гаку. – А там што за будынкі відаць? Кажыш: панскія, і лес таксама?

Ляжаць каля дарогі палосы,—далей шырокае панскае поле, а песьня гавора: Люблю свой край.. народ... і хаты... і нівы...

І я таксама адчуваю, што ўсё гэта моцна люблю і неяк сумна. Здаецца прылёг-бы грудзьмі да зямлі, прыслухаўся-б і... калі-б яна маўчала, сам расказаў-бы ёй аб гусьцейшым калосьсі, і аб больш шчасьлівых песьнях, якія яна пачуе.

Гледзячы на краявід прыпамінаю блізкіх, знаёмых і народ, які кожны дзень на ўсіх этапах адраджэнскага руху ахвярна здабываў і здабывае кожны крок.

З-заду засталося, сярод густога алешніку, сагнутага галлёдзіцай бярэзьніку, як гняздо зьвітае ў гушчары, возера Сьвітазь. Дарога падымаецца пад гару, здаецца самі мы яе цягнем за сабой, цяжка ідучы. А над намі і над зямлёй вісіць з рэдкімі неўраджайнымі зорамі ноч.

— — — — — — — — — — — — — — —

Адны ляглі спаць, другія гавораць, пяюць. Каля варот пуні сабралася жменя вясковай моладзі.

— Прыйшлі паслухаць вашых песьняў, гаворыць адзін з хлапцоў... — Школьная акцыя цяжкавата ідзе, усялякія перашкоды і прэсу сваю беларускую атрымліваем слаба... Сям-там сарганізаваны вясковыя беларускія каапэратывы...

— Мы ўжо няраз падавалі заявы на свае вечарыны. Не даюць дазволу. Закладалі гурток ТБШ. Не залегалізавалі... Цяпер падалі на БІГіК і тое самае...

Кажнаму з нас ведама, што ўсё гэта вымагае працы, расходаў і адначасна падрывае веру ў грамадзкія сілы.

Але глядзячы на чалавека, які спакойна аб гэтым гавора, бачыш у ім франтавіка, які расказвае аб панесеных ахвярах, часта глыбокіх і балючых, і адначасна чалавека поўнага веры ў слушнасьць сваей справы.

— Вось пайшло з нашай вёскі пару хлапцоў у Бярозу, з другіх вёсак таксама... На другую нядзелю думаем зладзіць забаву, паставіць нейкую рэч. Толькі вельмі бедныя мы на сцэнічныя творы. Старыя рэчы раз дваццаць перайгралі, ды не на нашы плечы яны пісаныя. Жыцьцё зусім іншае. Вось хоць-бы і ў нас... Можа што ў вас у Вільні такое напісалі-б, простае, блізкое, дзе ня трэба было-б з сябе дурняў корчыць на сьмех...

Ідзём далей на Кромань, на Любчу.

Шырока раскінуліся наднёманскія сенажаці, далей відаць лес-пушча нейкага графа. Зноў запяялі дзяўчаты. Песьня прыпомніла мінулы дзень. Мы праходзілі каля маёнтку. Каля сарака жнеяў за машынай вязала снапы. Каля дарогі стаяў наглядчык. Было пад вечар. Канчаючы працу жнеі пялі, пялі голасна, але без таго глыбокага, хвалюючага пачуцьця, якое чуецца ў народных песьнях. Прыслухаюся. Пялі яны нейкае „танго“...

— Вось і лес. Ня так горача будзе йсьці — адазваўся адзін з калегаў.

Малады густы сасоньнік цесна сплёўшыся. Толькі дзенядзе сіратліва падымаюцца старкі, адкідваючы на дарогу густыя, пахучыя смалой цені.

Вільня. Ліпень 1936 г.

Базыль Камароўскі

* * *

Як шуміць васільковая ніва,
як вецер шапоча таполі —
гэты шум
я душою украў мімаволі
і заплёў у мільён ціхіх дум;

як шэпча белатварай бярозцы
вецер казкі жыцьця
пад сакрэтам —
мімаволі падслухаў іх я
і ў песьню кладу казкі гэтыя;

і з пад стрэх саламяных, дзіравых,
дзе вецер вольны гуляў
танец — мяцеліцу —
таго танцу я гукі украў:
панясу іх на вёскі й аселіцы;

дзе плачуць галодныя людзі
на прадвесьні —
улавіў гэты плач я у грудзі,
а цяпер запляту яго ў песьні;

тую песьню, што скаргаю льецца,
што над ніваю — палоскаю
напявае жняя —
я украў і так ціха над вёскаю
ўсім пакрыўджаным напяваю я.

1936.

Z vandroŭki pa Navahradčynie.

„O, kraj rodny, kraj pryhožy,
Miły kut maich dziadoŭ!" — pisaŭ naš słaŭny Kołas. I zapraŭdy cudoŭnaja našaja Kraina Biełaruś. U jaki-by jaje kutok nia chiliŭsia — ucieŝyŝsia pryhožaściu rodnaha Kraju.

Pałova lipnia. Chvalistyja pali ŭvienčanyja biełaruskimi pracoŭnymi rukami: strojnymi radami stajać kałasistyja dziesiatki zbožža. Białejuć hrečki, razsyłajučy miadovy zapach ruplivym žniejam. Dzie-nia-dzie ciešyć voka razasłany śvietła-čyrvony dyvan kaniušyny. Šapoča i chvalujecca kałośsie jačmieniu. Tam i siam siadziać spoźnienyja kopki siena Dzie-nia-dzie bliščać vaziorca.



Hetkaja našaja Navahradčyna! Darožkami henaje ziamielki, minajučy sioły i miastečki, vandruje hramadka moładzi — dziaŭčata i chłopcy. Niekalki viełasypiedaŭ (roveraŭ) z bieł-čyrvona-biełymi ściažkami.

Heta — vybieh biełaruskaj studenckaj moładzi i jejnych sympatykaŭ.

Iduć da svaich. Iduć u narod. Iduć u svaje rodnyja vioski, kab paznać biedy i kryŭdy svajho pracoŭnaha brata, kab nacieŝycca pryhožaściu rodnych paletkaŭ, ablitych potam harotnaha sialanstva.

Iduć badzioryja, poŭnyja nadziei ŭ śvietłuju budučyniu, poŭnyja siły i hartu da zmahańnia za pravy svajho narodu.

Mačulna. Sialiba kalehi Vojteńki. Pieršy načleh... Sum i abureńnie: niekalki hadzin pierad prychodam studenckaj hramadki kalehu Vojteńku palicyja aryštavała i paviazła ŭ Navahradak.

Sumnaja matka apaviadaje, što kalehu Vojteńku byccam uziali za školnuju akcyju...

Valaŭka. Pravasłaŭny chvest Piatra i Paŭła. Ludna i hučna. „Prošen panuv vejść v podvuže" — zahadyvajuć palicyjanty — čałaviek šeść mundurovych i niekalki tajnych.

Usich nas u panadvorku „lehitymujuć"...

U chvalach voziera Švitazi zabyvajemsia pra roznyja prykraści.

Švitaź — voziera Mickieviča — ničym nia roźnicca ad inšych pryhožych biełaruskich vazioraŭ. Dziakujučy henamu paetu, pryciahaje jano bolš turystaŭ palakcŭ, jakija ŭvodziać dyssonans ŭ biełaruskija vakolicy hetaha voziera.



Mirski zamak.

Minajem miastečki i sioły. Voś mia.tečka Mir krasujecca z pryhožym zamkam, a voś ža i vialikaja Nalibockaja pušča i jejnaje voziera Kromań. Troški mienšaje jano ad Švitazi, ale moža navat pryhažejšaje. I zapraŭdy, tut bolš prytulna; dyk i našaja hramadka zatrymałasia na daŭžej. Tut u hetaj puščy čulisia jak doma. Našyja miłyja dziaŭčatki vyjavili tut svoj vialiki fizyčny i duchovy hart. Pieranosili viesieła roznyja niavyhody, a niekatoryja advažna pierapłyvali hłybokaje voziera Kromań (bolš kilametra).

Ale byvaj, Kromań!... Iznoŭ sioły, miastečki, rečki, uzhorki, lasy, nivy kałasistyja, sienažaci. A voś zbližajemsia da stalicy Navahradčyny — Navahradka.

Tut užo ŭzhorki pavialičvajucca štoraz bolš i na najvyšejšym z ich spatykajem sam Navahradak. Miesta nievialikaje, ale pryhožaje. Čuvać i vidać biełaruskaść. Dzie-nia-dzie spatykajucca biełaruskija vyvieski; čutna biełaruskaja mova.

Na pryhožaj horcy styrčać ruiny Hiedyminavaha zamku. Z hetaj horki, jak na dałani, vidać daloka ŭva ŭsie baki vakolicy Navahradka.

Stajała biełaruskaja studenckaja moładź na zamkavaj hary, hladzieła ŭdal i dumała ab budučyni Navahradčyny i ŭsiaje Biełarusi; ab jejnaj doli, jakuju moładź musić vykavać u harnie ŭsiaho biełaruskaha pracoŭnaha narodu.

Prypaminajučy projdzienyja miastečki i sioły, dzie vidać było narodny biełaruski ŭzdym, ućviardžałasia pierakanańnie, što **Biełaruś žyvie i budzie žyć.**

Pad hetkim kličam raźviazałasia ŭ Navahradku sioletniaja biełaruskaja studenckaja vandroŭka.

Uł. K.

А Івэрс

КАСЬБА.

Зазванілі па лугу
У стальныя косы —
Пакаціўся звонкі гул
Па крыштальных росах.

Там, дзе некалі трава
Буйна каласіла, —
Там кладзе за валам вал
Селянін — асілак.

Пад узмахамі касы
З кветкамі калосьсе
Дыямэнтамі расы
Плачам залілося:

„Нашу зрэзалі красу,
Маладыя годы —
Панясе балотам сум
Ветру дзікі подых“...

На лугу — трывожны сум,
Ў сэрцы — боль і раны...
З ранку самага кашу
Не сабе, а пану!

Эх, калі пачнуць зьвінець
Косы звонка ў сёлах..
Разьлівае чырвань-медзь
Сьвежым ранкам золак.

Думны

* * *

Доўга чаканае жніва настала —
Працы заўзятае й цяжкае час.
Але на сэрцы лягчэй неяк стала:
Новы хлябец будзе ў кажнага з нас.

Жытнія нівы пасьпелі на полі,
Дзе із малітвай хадзіў гаспадар —
З верай-надзеяй на лепшае ў долі
Кажны зьбірае засеяны дар.

Многа іх выйшла і моц не малая...
Выйшлі ў сьпякоту пот свой праліць...
Выйшлі па хлеб — Беларусь маладая
Далей ня можа ў голадзе жыць.

С. Хмара

ЖНІВО.

Бы ў трасцы якойсьці паўднёва паветра
Гатуецца, скача, танцуе
...Хоць хмарка-б адная!
...Хоць подых-бы ветру!
...Сярэдзіны ...рук аж ня чуюць.

Набегла кроў ў вочы. Пот рагамі — тварам;
Паветра ў грудзёх не хапае...
А з заду аконам — праклятаю марай
Ўсьцяж гыркам сваім падганяе.

І шэпча калосьсе зьнямоглым ціхутка:
Надыдзе пара нязвычайна!
І зьверне палеткі тут трактар магутны
І пойдзе па полі камбайна.

Шапочуць калосьсі аб зьмене вялікай,
А сонца сярпамі гуляе.
Гэй прыйдзе! Йшчэ прыйдзе канец пары дзікай!
К' нам іншыя дні завітаюць!

Казлоўшчына, 25.VII.26.

K. G. Chesterton — M. Gorkij

(*Z pryčyny ich śmierci*).

U miesiacy červieni sioleta rasstalisia z dačasnym žyćciom dva vialikija i słaŭnyja tvarcy litaratury: K. G. Chesterton i M. Gorkij, śmierć katorych mocnym recham praniasłasia pa śviecie.

— Keith Gilbert Chesterton (čytaj - Č e s t e r t o n) radziŭsia ŭ 1874 h. u Anhlii. Zdabyŭšy naležnuju aśvietu, mnoha jeździŭ pa śviecie, a miž inšym, byŭ i ŭ Vilni. Piśmienicku svaju pracu pačynaŭ jak publicyst. Pieršyja jahonyja knižki, jakija pačali pajaŭlacca ad 1900 h., nia vyklikali vialikaha zacikaŭleńnia. Adnak-ža vydanaja ŭžo ŭ 1905 h. knižka p. n. „Heretyki", u katoraj K. G. Ch. vystupiŭ praciŭ matarjalistyčnaha pahladu na śviet i žyćcio, pryniasła jamu šyroki rozhałas. Dalej Chesterton vydaje: u 1908 h. pavieść, poŭnuju humaru, p. n. „Čałaviek, jaki byŭ čaćviertakom"; u 1910—knižku p. n. „Kuli i kryž" (ab relihijnych prablemach), a paśla knižki: „Žyvy čałaviek", „Pavarot Don Kichota", kryminalistyčnuju pavieść „Ajciec Braun" i inš. Ahułam Chesterton napisaŭ 108 tomaŭ, siarod jakich było 7 pavieściaŭ, 12 zbornikaŭ novelaŭ, 47 tomaŭ studyjaŭ i narysaŭ, 12 tomaŭ paezii, 21 tom litarackaje krytyki i inš. Aprača hetaha pisaŭ jon tysiačy artykułaŭ da vydavanaha im-ža tydniovika i inšych časapisaŭ.

K. G Chesterton byŭ protestantam, paśla adnak (1922) staŭsia vieručym i praktykujučym, navačasnym adrodžanym katalikom Byŭ jon piśmieńnikam, dramaturham, paetam, krytykam, publicystam, dziejačom słaŭnym na ŭvieś śviet. Baraniŭ jon pieradusim drobnaje indyvidualnaje ŭłasnaści zmahaŭsia jak z pryvatnym tak i z dziaržaŭnym kapitalizmam. Chesterton byŭ nacyjanalistam, ale nacyjanalistam, jaki šanavaŭ čužy nacyjanalizm taksama jak i svoj. Pamior 14.VI.1936, pakidajučy pa sabie vialikija i cennyja tvory.

— Maksim Gorkij — heta pseŭdonim Alaksieja Maksimaviča Pieškova, syna tapicara. Radziŭsia A. M. Pieškov ŭ Nižnim Noŭharadzie ŭ Rasiei 16.III.1868 h. Vučycca pačaŭ majučy 7 hadoŭ, u pačatkavaj škole. Budučy siratoju, chutka adnak musiŭ školu pakinuć. Žyćciovyja jahonyja abstaviny byli žudasnyja i davodzili jaho da namieru samahubstva. Pačynajučy ad 10 hadoŭ jon zajmajecca roznaju rabotaju. Spačatku byŭ chłapcom na pasyłki, paśla kuchcikam, teatralnym statystam, kačaharam, storažam, urešcie — pracavaŭ u advakata, ciahaŭsia pa Rasiei, a ŭ 1892 h. vystupiŭ na litaraturnaj nivie z raskazam: „Makar Čudra". Za hety čas mnoha paciarpieŭ jon, mnoha pracavaŭ nad saboj, chvareŭ, byŭ aryštoŭvany za svaju pracu i suviaź z tajnymi revalucyjnymi arhanizacyjnmi, paznaŭ hłybaka žyćcio i h. zv. nižšuju klasu.

Tvorčaść M. Gorkaha bahataja i pierakładanaja ŭžo na roznyja movy, u hetym liku i na biełaruskuju. Matyvami jaje

źjaŭlałasia naŭpierad žyćcio biedniakoŭ-praletaraŭ. Hałoŭnyja jahonyja tvory heta: zborniki raskazaŭ, pjesy: „Miaščanie“, „Na dnie“, „Barbary“, „Vorahi“, raman „Maci“, povieści: „Dzieci“, „Ludzi“, knižka „Niasučasnyja dumki“, vydanaja ŭ 1918 hodzie, u katoraj jon vostra pratestavaŭ prociŭ teroru i masavych rastrełaŭ, pravodžanych tady ŭ Rasiei, i šmat inšych.

M. Gorkij pisaŭ parasiejsku, byŭ jon sapraŭdnym i niazvyčajnym mastakom piara, baraćbitom za praŭdu i ščaście dla ŭsich ludziej, a asabliva dla praletarjatu, i z hetaj apošniaj pryčyny, nazyvajuć jaho praletarskim piśmieńnikam Ale Gorkij byŭ nia tolki piśmieńnikam, a j šyroka viedamym hramadzkim dziejačom. Byŭ prytym hanarovym siabram Biełaruskaj Akademii Navuk. Pamior 18.VI.1936 u Gorkach kala Maskvy.

Vartaść tvorčaści Gorkaha biazumoŭna vialikaja, a imia jahonaje, tak jak i imia Chestertona ŭpisana ŭžo ŭ historyju litaratury załatymi litarami. *j. n.*

Žaŭnierskija mohiłki pad Verdunam u Francyj, dzie ŭ časie Suśvietnaje vajny zhinuła 700,000 niemcaŭ i 500000 francuzaŭ.

Źjezd „Związku Młodej Wsi“ ŭ Vilni

28-ha červienia siol. u Vilni adbyŭsia čarhovy hadavy źjezd polskaje arhanizacyi moładzi — „Związku Młodej Wsi“, na čale katoraj u Vilenščynie staić polski pasoł, asadnik, Ul. Kamiński. Dziela taho, što ab arhanizacyi hetaj my niaraz užo davoli šmat pisali, ciapier ab joj padrobna havaryć nia budziem. Padamo tolki niekatoryja hałasy ŭčaśnikaŭ źjezdu, jakija vymoŭna charakteryzujuć stan „ZMW“.

Naŭpierad treba ścvierdzić, što źjezd heny raniej byŭ naznačany, a adbyŭsia tolki ŭ kancy červienia. U paraŭnańni z letašnim źjezdam i raniejšymi, sioletni źjezd byŭ nadta słabieńkim i słušna kazaŭ učaśnik źjezdu Kazłoŭski z Śviancian, što „siańnia majem pustki“. Havaryŭ ab hetym i pravadnik Kryviec, jaki pry tym padčyrknuŭ, što „pavodle spravazdačaŭ praca pasoŭvajecca napierad, a faktyčna jana nia jdzie i „koły“ likvidujucca“... Učaśnik źjezdu z Vilejki kazaŭ, što „koły paŭstajuć, ale zaraz zamirajuć“... „Pry tym byvaje tak, što adna asoba jość i prezasam i skarbnikam i sakratarom“... „U biblijatekach ža razsyłanych poŭna jość knižak z źmiestam pornografičnym“... Na źjeździe hetym była tak-ža padniata dyskusija ab ziemlarobskich škołach i ahułam ab navučańni ŭ pačatkavych škołach polskich na vioscy. Voś-ža ŭ hetaj spravie mocnyja słovy skazaŭ niejki Sutovič, jaki zajaviŭ, što „u škole niama navuki, a jość parodyja navučańnia“..

U kancy zabraŭ hołas, dziela adkazu na ŭsie zakidy pas. Kamiński i, jasna, u napušanaści kryčaŭ, što jany ŭsio samastojna zdabuduć, što „koły“ dobra raźvivajucca i h. d. i h. d. „Zabyŭsia“ tolki pas. Kamiński ab adnym vielmi važnym mamencie, jakoha nia moža papravić i jaki havoryć jasna, što arhanizacyja „ZMW“ ŭtrymlivajecca koštam dziaržaŭnym, koštam padatkaŭ, bo voś u hrašovaj spravazdačy było skazana, što „koły“ za 1935 h. zapłacili składak usiaho 68 zł. i 60 hr. a „subwencje wynosiły 8,912 zł.“, a na 1936 h. „subvencje“ pradbačanyja da 11,000 zł. A jość jašče napeŭna i pabočnyja miascovyja dapamohi, bo-ž u „ZMW“ u Maładečnie staršynioj „ZMW“ jość pan vice-starasta, aproč taho vielmi prychilna hladzić na „ZMW“ i Školnaja Kuratoryja i na vioscy ŭ henaj arhanizacyi pracujuć vučyciali i inšyja ŭradaŭcy.

Voś-ža dziakujučy tolki hetamu i trymajecca „ZMW“ u Vilenščynie. Dziakujučy tolki takim-ža padtrymańniam trymajecca „ZMW“ i ŭ Navahradčynie, Horadzienščynie i na Paleśsi. Kali b nia było padtrymańnia sa starany, „ZMW“ daŭno-b na našych ziemlach pierastaŭ isnavać. Ale i tak hetak budzie, bo śviedamaść biełaruskaja z kožnym dniom što-raz bolš pašyrajecca i moładź usiudy ŭžo pačynaje razumieć, što nie ŭ „ZMW“ joj treba jści, a ŭ svaje biełaruskija arhanizacyi, jakija sapraŭdy dbajuć ab palepšańnie doli biełaruskaha narodu.

n.

II-ja BIEŁARUSKAJA PILIHRYMKA Ŭ KALVARYJU

Jak my ŭžo pisali, sioleta, za prykładam minułaha hodu, u pieršuju niadzielu m-ca červienia, h. zn. 7.VI, adbyłasia 2-ja biełaruskaja pilihrymka ŭ Kalvaryju, ładžanaja Vilenskim Kaścielnym Kamitetam. Ciapier padajom tut źnimki, zroblenyja



II Biełaruskaja Pilihrymka ŭ Kalwaryju 7.VI.36 h.

Uhary: try zdymki biełaruskaje pilihrymki ŭ časie pachodu ŭ Vilni na Niamieckaj vulicy. Načale za kryžam jduć Ks. Ks. Stankievič i Duliniec, dalej chor i narod. Unizie: dźvie zdymki (zleva) pilihrymki ŭ časie abchodu darohi kryža ŭ Kalvaryi i treciaja (apošniaja) bieł. pilihrymka pry ŭvachodzie ŭ Kalvaryjski Kaściol.

ŭ časie henaj pilihrymki, jakija śviedčać ab kolkaści jaje ŭčaśnikaŭ i ab paradku. Adnačasna treba pažadać, kab da bieł. pilihrymki kožny hod dałučałasia što-raz bolš ludziej, bo-ž jana maje vialikaje značeńnie ŭ našym žyćci relihijnym i hramadzkim.

10-leććie vilenskich litoŭskich skaŭtaŭ

Sioleta minuła 10 hod, jak jaŭna pačała pracavać arhanizacyja vilenskich litoŭskich skaŭtaŭ. Pačatki hetaj arhanizacyi značna starejšyja, jany adnosiacca da 1918 h., ale tady pracavać jej prychodziłasia tajna. Raspačałasia tady heta skaŭckaja arhanizacyja siarod vučnioŭskaj moładzi litoŭskich školaŭ u Vilni. Hrunt dla razvoju akazaŭsia padatny. Za dva miesiacy litoŭskich skaŭtaŭ užo naličałasia 120 asob. Litoŭskim vilenskim skaŭtam, z pryčyny niespakojnaha času ŭ krai, prychodziłasia pracavać tajna až da 1926 h. Prasili jany dazvołu na jaŭnuju pracu ŭ uładaŭ administracyjnych i ŭ vyšejšaj ułady skaŭtaŭ, ale nijak nie mahli jaho dastać. Adnak u 1926 h. pačali jany pracu jaŭnuju, choć jašče nie aficyjalna.

Urešcie stałasia važnaje zdareńnie ŭ žyćci vilenskich litoŭcaŭ i ŭ žyćci litoŭskich skaŭtaŭ: u 1927 h. pamior patryjarch litoŭskaha adradžeńnia dr. J. Basanovič, hanarovy siabra skaŭtaŭ. Voś-ža na jaho pachovinach litoŭskija skaŭty ŭ Vilni pieršy raz vystupili publična. Paśla hetaha dastali ŭrešcie aficyjalny dazvoł na jaŭnuju pracu.

Ad hetaha času litoŭski skaŭtynh u Vilni raźvivaŭsia pamysna. U 1928 h. pačaŭ vychodzić, adbivany na šapirohrafie skaŭcki časapis „Vilenski Skaut", a tak-ža byŭ vydany skaŭcki kalendar. U hetym-ža hodzie byŭ założany addzieł litoŭskich skaŭtaŭ u Śviancianach.

Pačynajučy ad 1929 h. až da našych časaŭ litoŭski vilenski skaŭtynh napatykaŭ i ŭściaž napatykaje roznyja pieraškody na darozie svajej idejnaj pracy. Adnak, nia hledziačy na heta, skaŭtynh hety raźvivajecca pamysna, karysna pracujučy dla duchovaha dabra litoŭskaj moładzi i litoŭskaha narodu ahułam.

My, biełaruskaja moładź, skaŭckaj arhanizacyi litoŭskaj vilenskaj moładzi, z pryčyny 10-hodździa jaje isnavańnia, hetym vyražajem svaje najlepšyja pažadańni dalejšaha, pamysnaha raźvićcia i pracy!...

XI Olimpijada ŭ Berlinie.

Ad 1 da 17 žniŭnia siol. adbyvajucca ŭ Berlinie spartovyja ihry XI-aj Olimpijady. Da ihraŭ hetych stała 4844 čałavieki, u hetym liku 4503 mužčyn i 341 žančyn, z 35-ci roznych dziaržaŭ. U časie Olimpijady była tak ža naładžana vystaŭka spartovaha mastactva, na jakoj najbolš naharodaŭ dastali Niemcy, bo atrymali jany 5 medaloŭ załatych, 4 siarebranych i 2 branzovych. Polšč zdabyła 1 medal siarebrany i 2 branzovyja.

Padčas spartovych ihraŭ za 6 dzion byli ŭstanoŭlenyja hałoŭnyja rekordy:

1) U biehu na 100 mtr. z mužčynaŭ pieršaje miesca i załaty medal zdabyŭ amerykanski nehr Owens, jaki prabieh

hetu adlehłaść u praciahu 10,3 chvilin(sekundaŭ),z žančynaŭ najchutčej, bo za 11,5 sek. prabiehła 100 mtr. amerykanka Stefens.

2) Padčas skoku ŭharu najvyšej skočyŭ amerykanski nehr Cornelius Johnson, asiahnuŭ jon vyšyniu 2,03 mtr., zdabyvajučy hetym załaty alimpijski medal Druhoje i treciaje miesca pa vyšyni skokaŭ taksama zaniali amerykancy, zdabyvajučy takim čynam siarebrany i miedny medali.

3) U dalačyniu najdalej skočyŭ tak-ža nehr Owens, asiahajučy adlehłaść 8,06 mtr. i za heta dastaŭ załaty medal.

4) Kulaj najdalej (16,20 mtr.) kinuŭ niemiec Woellke, zdabyvajučy załaty medal.

5) U kidańni kapjom 1-je miesca ŭziaŭ niemiec Stoeck, kidajučy na 71,84mtr., a z žančyn 1-je miesca zaniała niemka Fleischer.

Nehr Owens dabiahaje da mety bjučy rekord na 100 m. Dalej vidać publiku.

6) Dyskam najdalej, 47,63 mtr.) kinuła z žančynaŭ niemka Mauermeyer, z mužčynaŭ — amerykaniec Carpenther, kinuŭ jon na 49,36 mtr.

7) U biehu na 200 mtr. zdabyŭ załaty medal nehr Owens, jaki prabieh henu adlehłaść u časie 20,7 sekundy.—U biehu na 5,000 mtr. pieršyja 2 miejscy zdabyli finy: Hoeckert 14.22.2 i Lenhinden. U biehu na 10,000 metraŭ pieršyja try miescy zaniali finy, katoryja hetym zdabyli załaty, siarebrany i miedny medali.

Nastupnuju XII Olimpijadu ŭ 1940 h. budueć ładzić Japoncy ŭ svajej stalicy Tokijo.

Z KRAJU

Moładź, uśviedamlajsia!

Hajnaŭka kala Biełaviežy. U Hajnaŭcy jość tartak, kala jakoha koncentrujecca ŭsio rabotnickaje žyćcio. Pracujuć tut pieravažna biełarusy z roznych kutkoŭ biełaruskaj ziamielki, jość tak-ža i palaki. Moładzi źbirajecca mnoha.

Na biełaruskuju, jaščе małaśviedamuju nacyjanalna moładź robiać „palavańnie" roznyja polskija arhanizacyi, jak „Strzelcy", ZZZ, PWL, PPS i inš. Usie jany dajuć nam pryhožańkija abiacanki, ale nijakaje kankretnaje karyści, a časta navat prynosiać škodu. Bo-ž, viedama, čužyja heta arhanizacyi i dziela taho pieradusim svaje, a nie biełaruskija majuć na ŭvazie intaresy.

Z niedachopu svaich biełaruskich arhanizacyjaŭ, niekatoryja biełarusy naležać da PPS, jak da arhanizacyi najbolš „pa duchu". Razam z inšymi tavaryšami, naležu da jaje i ja Ale choć my da jaje naležym, adnak dobra sabie ŭśviedamlajem, što heta jość čužaja arhanizacyja.

U tartačnaj zali PPS ładzić časta viečaryny, na jakija źbirajecca rabotnickaja moładź, a tak-ža i intelihiencyja. Na takich viečarynach niekatoryja sa sceny deklamujuć polskija vieršy i śpiavajuć polskija pieśni. Ja chaču navučycca na pamiać jakiś pryhožy biełaruski vierš i pradeklamavać jaho na scenie, bo naša moładź hetaha choča. Dumaju, što heta mnie ŭdasca. Pry hetym chaču zaklikać biel. rabotnikaŭ inšych miascovaćciaŭ, kab jany tak-ža paznavali sami siabie, kab viedali chto my takija, jakimi my možam być dy kab usiudy na viečarynach deklamavali nam tvory našych biełaruskich paetaŭ.

Małady rabotnik biełarus.

Цяжкое палажэньне моладзі.

в. Шымкі, Орля над Нёмнам. У нас, так як і ў іншых мясцовасьцях, моладзь жыве ў страшна цяжкіх варунках. Нястача зямлі і заробкаў даводзіць моладзь да трагічнага стану. Моладзь ня мае ніякай пэрспэктывы прад сабой, ня мае магчымасьці ані залажыць гаспадарку, ані наладзіць сямейнага жыцьця, ані наагул у які небудзь спосаб палепшыць свой быт· І так жыве з дня на дзень марнуючы сваe маладыя сілы, сваё жыцьцё.

Моладзь ня мае магчымасьці так-жа заняцца грамадзкай працай. Цяпер ўжо дайшло да таго, што бяз спэцыяльнага дазволу на вёсцы ня можна зрабіць найменшай вечарынкі. Паліцыя надта часта робіць падазрэньні, сьледзтвы, пазывае на пастарунак, пытае, запісвае і пытае...

Ня гледзячы на гэта, беларуская сьведамасьць сярод моладзі далей шырыцца, а ў сувязі з школьнай акцыяй павялічваецца ў нас так-жа і жаданьне роднае школы.

А. А.

BIEŁARUSY I AB BIEŁARUSACH ZAHRANICAJ

— 24.VI siol. u Berlinie hram A. Škutka—biełarus—u zali Ukrainskaha Nac. Abjadnańnia pračytaŭ paniamiecku referat ab Biełarusi i Biełarusach. Siarod prysutnych na referacie było mnoha ukraincaŭ, niemcaŭ, hruzinaŭ, baŭharaŭ i inšych čužyncaŭ.

— U vialikich anhlijskich hazetach „Manchester Gardian" i „Nju Stejtsman End Nejshen" sioleta viasnoj byli źmieščany artykuły pałk. S. L. Malone ab pałažeńni Biełarusaŭ u Polščy.

— Na vystaŭcy katalickaj presy ŭ Vatykanie ŭ polskim addziele vystaŭleny № 17 z 1936 hodu „Biełaruskaj Krynicy" i № 12 z 1935 h. biełaruskaha unijackaha čas. „Да Злучэньня!".

— Viedamy biełaruski spartoviec z Vilni, Jury Kiepiel sioleta braŭ udzieł na vypieradkach łodkami ŭ Budapešcie (Madziarščyna) i ŭ Vienie (Aŭstryja) Pry tym 7.VI vyjhraŭ pieršy eliminacyjny bieh madziarskich vieślaroŭ, paśla 14.VI zaniaŭ I-šaje miesca siarod tych ža madziarskich vieślaroŭ, a ŭ Vienie na mižnarodnych vypieradkach łodkami zaniaŭ druhoje miesca.

— Ad 28.VII da 10.VIII sioleta ŭ Vienie ŭ časie XV Mižnarodnaha Katalickaha Kanhresu Studenckaje Moładzi «Pax Romana" adbyłasia vystaŭka presy moładzi. Na vystaŭcy hetaj presu bieł. moładzi pradstaŭlaŭ: „Šlach Moładzi" (№№ 3, 4, 5 i 6 za 1936 h.), „Studenckaja Dumka" (№№ 1(11), 1(12) i 4(14), a tak-ža „Bieł. Krynica" z „Studenckaj Trybunaj" (№№ 4(15), 8 (19) i 1 (20).

REVALUCYJA Ŭ HIŠPANII.

U kancy m-ca lipnia siol. nacyjanalisty i manarchisty z častkaj vojska arużna vystupili suproć uradu, jaki ciapier u rukach levicy. Pa ŭsiej Hišpanii jduć kryvavyja bai. Jość tysiačy zabitych. Chto pieramoža jašče niaviedama. — Na źnimcy vidać jak viernyja ŭradu žaŭniery i rabotniki stralajuć z harmat na paŭstancaŭ.

CHRONIKA

Z biełaruskaha žyćcia

Nie dali dazvołu na śviatkavańnie. 12-ha lipnia sioleta, jak my ŭžo pisali, u Žodziškach, Vialejskaha pav. miełasia adbycca śviatkavańnie 10-ch uhodkaŭ isnavańnia tam Hurtka Biełaruskaha Instytutu Hasp. i Kultury. Śviatkavańnie heta adnak nie adbyłosia, bo administracyjnyja ŭłady nie dali dazvołu.

Revizii. Unočy z 30 na 31 lipnia sioł. u Vilni palicyja zrabiła reviziju ŭ staršyni TBŠ adv. F. Steckieviča, hram. M. Mancevića, ŭ bieł. paetaŭ Tanka i Fr. Hryškieviča i ŭ red. „Našaj Voli".

Kanfiskaty. 31-ha lipnia sioł. Vilenskaje Haradzkoje Starastva skanfiskavała № 33 „Bieł. Krynicy" za artykuł p. n. „Nastroi vioski" U hety ž samy dzień tyja-ž ułady skanfiskavali № 11 „Našaj Voli", a paśla № 3 „Biełaruskaha Frontu".

Maładyja biełarusy z vyšejšaj aśvietaj. Na pačatku m-ca lipnia mgr. St. Stankievič zdaŭ ekzamin i atrymaŭ tytuł doktara humanistyčnych navuk. Sioleta viasnoj taksama skončyli vilenski universytet i atrymali tytuły: magistra prava—hram. J. Burak i magistra filozofii —hram. T. Iljašević.

Ahulny schod Hałoŭnaje Upravy TBŠ. 5.VII.36 ŭ Vilni adbyŭsia ahulny Schod Hałoŭnaje Upravy TBŠ, na jakim vybrany Prezydyjum TBŠ u nastupnym składzie: F. Steckievič— staršynia, M. Kiepiel i V. Tumaš—vice-staršyni, Fr. Hryškievič—sakratar i R. Šyrma — skarbnik.

Biełaruski Dom u Vilni. Niadaŭna ŭ Vilni paŭstaŭ arhanizacyjny Kamitet budovy Biełaruskaha Domu ŭ Vilni.

V. Advažny viarnuŭsia na Baćkaŭščynu. Biełaruski piśmieńnik V. Advažny, jaki prabyvaŭ zahranicaj, viarnuŭsia ŭžo na Baćkaŭščynu i žyvie ŭ adnym z miastečkaŭ Vilenščyny.

30-tyja ŭhodki tvorčaści Jakuba Kołasa. Sioleta prypadajuć 30-tyja ŭhodki litaraturnaje tvorčaści Biełaruskaha Narodnaha Paeta Jakuba Kołasa. Voś-ža treba było-b u Vilni, a tak-ža i pa vioskach jubilej hety naležna adśviatkavać.

Biełarusy na navukovych źjezdach. Hram. Uł. Samojła i hram-ka M. Milučanka ad imia Bieł. Navukovaha T-va brali sioleta ŭdzieł u źjeździe Biblijatekaroŭ u Varšavie. Dr. J. Stankievič u toj-ža Varšavie braŭ udzieł sioleta u źjeździe daśledavalnikaŭ nierasiejskich movaŭ SSRR. Čytaŭ jon tam tak-ža referat ab praviedzienaj kamunistami reformie biełaruskaj hramatyki, katoraja, jak viedajem, pryčyniajecca da ŭpadabnieńnia biełaruskaha jazyka da jazyka rasiejskaha.

Z BSSR. — № 116 mienskaje „Звязды" studentka III-ha kursu Vyšejšaha Pedahohičnaha Instytutu O. J. Mazinh piša: „Zaraz usie našy dumki zaniaty adnym—na vydatna skončyć navučalny hod. Paśla ž pakinuć na leta ścieny navučal. ustanoŭ.

Рэдагуе Калегія.

Выдаюць: Я. Багдановіч і А. Шутовіч. Рэдактар Я. Найдзюк

43 studenty hieohrafičnaha fakultetu pajeduć na vytvorčyja ekskursii ŭ Krym, Kaŭkaz, Ural i Zapalarje. Heta dobra. Ale čamu nie arhanizavać takuju ekskursiju pa BSSR, tym bolš, što mnohija drenna viedajuć svaju respubliku. U roznyja ekskursii pajeduć jašče 100 studentaŭ. Heta viadoma, dla Instytutu, jaki naličvaje zvyž 1000 studentaŭ, niedastatkova".

Z hetaha bačym, što kiraŭnikoŭ nazvanaha Instytutu bolš cikavić inšyja krainy Savietaŭ čymsia Biełaruś. Dziejecca heta dziela taho, što z biełaruskaj moładzi chočuć zrabić ludziej biez biełaruskaha narodnaha pačućcia, jakija tolki niaśli-b našamu narodu kamunistyčnuju doktrynu ŭ biełaruskaj movie. Padobna pahardžajuć ciapierašnija mienskija vučonyja i historyjaj bieł. narodu, ale zatoje n kožnym kroku pilna sočać za partyjnaj vučobaj i palithramataj.

Treba jašče adciemić, što pravilny hołas stud. Mazinh jość adzinočnym i chiba doŭha jašče nia budzie mieć šyrejšaha vodhulla ŭ Rad. Biełarusi. Vierym adnak, što biełaruskaje nacyjanalnaje žyćcio dojdzie da poŭnaha svajho raźvićcia.

З ВЫДАВЕЦКАЙ НІВЫ

„На этапах". Пад гэткім назовам у другой палове ліпня выйшаў з друку, прыгожа выданы, вялікі зборнік вершаў Масіма Танка. Трэба спадзявацца, што ў зборніку гэтым былі сабраны найлепшыя творы гэтага паэта і ён бязумоўна моцна ўзбагаціў-бы нашую літаратуру і бел. кніжны рынак. Нажаль аднак, адміністрацыйныя ўлады зборнік гэны сканфіскавалі.

Сяргей Паўловіч — **Сьвяшчэнная Гісторыя Новага Завету.** Падручнік для беларускіх школаў і самаадукацыі. Багата ілюстраваны. Мае 152 бачыны фармату 8⁰. Выданы з багаславенства Праваслаўнага Мітрапаліта Дзяніса ў Варшаве, у Сынадальнай Друкарні. Вонкавы выгляд кніжкі салідны, зьмест яе рэлігійны. Ёсьць гэта, сёлета, другая ўжо цэнная беларуская рэлігійная кніжка апрацаваная ведамым беларускім пэдагогам, кандыдатам багасловія С. К. Паўловічам.

„Калосьсе" кн. 3. 15-га ліпня выйшла з друку 3 (7) кніжка беларускага літаратурна-навуковага квартальнага часапісу „Калосьсе". У кніжцы гэтай, якая мае 64 вялікіх бачынаў, на першым месцы знаходзім І-ю частку новае паэмы Міхася Машары п. н. „Мамчыная Горка". Твор гэты дужа прыгожы і дзеля гэтага цешымся, што друкуецца ён адначасна і адзельнай кніжкай. Далей надрукаваны: другая частка паэмы „Нарач" — М. Танка, далейшы цяг рэфэрату Кс. Ад. Станкевіча аб Фр. Скарыне і шмат іншых цікавых і важных працаў і вестак з беларускага культурнага жыцьця.

Зварочваем увагу, што цана „Калосься" зьніжана да 50 гр. за кніжку. Падпіска на год усяго 2 зл. Адрас Рэдакцыі „Калосься": Вільня, Завальная 1—2.

Міхась Машара—**„Лёгкі хлеб".** Драма ў 3-х актах з жыцьця вясковае моладзі. Выд. „Беларускай Крыніцы". Вільня 1936 г. Бач. 64. Фармату 8⁰. Цана 40 гр. — Кніжка гэта выйшла з друку нядаўна, шырэй аб ёй напішам пасьля.

U SIAČYNA

— U Polščy chodziać čutki, što ŭ chutkim časie majuć nastupić pavažnyja palityčnyja źmieny. Mnoha havorycca i pišycca ab patrebie ziamielnaj reformy; ci budzie adnak jana praviedziena — nia viedama.

— Niadaŭna ŭ Varšavie atraviłasia 23-ch hadovaja studentka Halina Vałažanka, jakaja pakinuła piśmo, u katorym miž inšym pisała: Ja była zdarovaja, enerhičnaja i dosyć adukavanaja, strašna bajałasia śmierci, adnak nie znajšła miesca pad soncam, mima ŭsilenych biespieraryŭnych starańniaŭ, dastać choć-by jakuju zarabkovuju pracu — nie zmahła. Pastanaviła pierarvać takoje žyćcio... — H. Vałažanka svajej śmierciu ŭćviardziła praŭdu ab trahedyi maładoha pakaleńnia, što ludzi zdarovyja, enerhičnyja, pracavityja, prahnučyja žyćcia nie znachodziać sabie miesca pad soncam.

A što kazać ab biełaruskaj moładzi, katoraj na kožnym miescy machajuć asymilatarskim kułakom, za minimalnyja damahańni abzyvajuć kožnaha kamunistym i hraziać usimi paśladoŭnaściami, jakija čakajuć čałavieka z takoju piačatkaju? — Pałažeńnie maładoha biełaruskaha pakaleńnia jašče bolš trahičnaje.

— Revalucyja ŭ Hišpanii tryvožyć uvieś śviet. Usie bajacca, što moža jana vyklikać suśvietnuju vajnu, bo tudy pačali miašacca inšyja dziaržavy. Naprykład: italijanskija i niamieckija fašysty pamahajuć paŭstancam—nacyjanalistyčna-manarchistyčnym, a Francyja i Saviety pamahajuć uznoŭ uradu.

— Niamieččyna z Aŭstryjaj — hetyja dźvie niamieckija dziaržavy — padpisali miž saboj dahavor, što ŭ svajej palitycy buduć kiravacca intaresami ahulna-niamieckimi. Zbližeńnie Niamieččyny z Aŭstryjaj jość faktyčna zbližeńniem niamiecka-aŭstryjacka-italijanskim, bo Aŭstryja dahetul u svajej palitycy pasłušnaja była italijanskamu dyktataru Musoliniamu. Takim čynam u Eŭropie tvorycca novy blok dziaržaŭ, u jaki byccam aprača Niamieččyny, Italii i Aŭstryi majuć uvajści: Madziarščyna, Baŭharyja, a mo' navat i Juhasłavija. Blok hetych dziaržaŭ skiravany budzie byccam suproć Savietaŭ.

— Abisynija žyvie. Niadaŭna abisyncy, sarhanizavaŭšy svajo vojska, pačali nanova baraćbu z italijancami. I tak dahetul adabrali ŭžo miesta Desju—raniejšuju hałoŭnuju vajskovuju siadzibu Negusa i amal nie adabrali Addis-Abeby, bo pradmieście hetaha miesta pierachodziła nia raz z ruk u ruki. Słovam, u Abisynii niespakojna. Negus maje byccam viarnucca na baćkaŭščynu i kaža, što choć u Lizie Narodaŭ jamu ničoha nie ŭdałosia zrabić, to adnak jon spravy svaje vykanaŭ i ciapier abisynskim vajakam chleba i amunicyi brakavać nia budzie.

PAŠTOVAJA SKRYNKA

M. Jure—ču i ŭsiej susiedniaj moładzi: Prośbu spaŭniajem, da čužoj arhanizacyi radzim nie naležać, a kali naležać, to rabić u joj svaju biełaruskuju rabotu ŭsimi mahčymi sposabami.

A. Kaval—skamu: Vierš Vaš da druku nie padchodzić, bo jość jon pierarobkaj vieršu K. Bujło: „Lublu naš kraj". Pisać treba samastojna.

A. Adam—ču: Škoły treba damahacca, treba składać deklaracyi. Ab pabojach padavajcie dakładnyja viestki: chto, dzie i kali, kaho pabiŭ, tady budziem padavać heta da ahulnaha viedama i budziem staracca, kab razbojniki byli pakarany. Karespandencyju budziem staracca nadrukavać.

A. Івэрсу: Верш атрымалі і друкуем з малой цэнзуральнай папраўкай.

A. Śpirydoviču: Vieršy słabieńkija. Radzim pisać prozaj.

У. Гірысу: Твор Ваш слабы, пішыце спачатку карэспандэнцыі з жыцьця вёскі, а пасьля прабуйце пісаць кароткія расказы.

Ул. Мар—шу: Карэспанцэнцыю, як бачыце, друкуем.

С. Хмары: З атрыманых вершаў адзін друкуем з малой папраўкай, рэшты не абяцаем друкаваць, бо ўсім ім гразіць канфіската.

Б. Камароўскаму: У кніжнай справе рэальна і зараз памагчы ня можам, але дзе можна будзе, будзем гаварыць. Адк з у справе вершаў знайдзеце ў № 6 „Шл. М.", які высылаем Раней Вы яго не атрымалі думаем дзеля таго, што ня быў яшчэ ў нас зьменены Ваш адрас.

Думнаму: Вершы слабыя, але адзін папраўіўшы друкуем. Зьвярнеце ўвагу на папраўкі і працуйце больш над сабой.

В. Хомцы: Просьбу перадалі ў Школьны Сакратарыят. Вершы, на жаль, слабыя. Папрабуйце пісаць прозай